**Прычына памылак:**

Калі ў электроннай праграме дамінуючым з'яўляецца *прыём падстаноўкі*, заснаваны на сэнсава-структурным паралелізме, то прычынай памылак у такіх тэкстах будзе ***неразмежаванне міжмоўных амонімаў, паронімаў і полісеміі***. Удумлівы перакладчык пазбягае гэтага, выкарыстоўваючы прыём трансфармацыі, пры дапамозе якога ўдакладняе лексіка-семантычнае значэнне словаформ у мове арыгінала і толькі тады выкарыстоўвае адпаведную форму ў мове перакладу.

1) Образование (*рус.*) – 1) утварэнне (*бел.*): *'тое, што ўзнікла ў выніку якога-н. дзеяння, працэсу'*; 2) адукацыя, асвета (*бел.*): *'сукупнасць ведаў, набытых у выніку навучання'*.

2) Бескорыстный (*рус.*) – бескарыслівы (*бел.*): *'які не імкнецца да асабістай карысці, выгады'*. Бескарысны (*бел.*): *'які не прыносіць карысці'*.

3) Бремя (*рус.*) – цяжар (*бел.*): *'цяжкая ноша, груз вялікай вагі'*. Бярэмя (*бел.*): *'такая колькасць чаго-н. (дроў, саломы, бульбоўніку і інш.), што можна абхапіць абедзвюма рукамі і панесці; ахапак'*.

4) Нікто (*рус.*) – ніхто (*бел.*): *'ні адзін чалавек'*. Нехта (*бел.*): *'нейкі чалавек, нейкая істота; невядома хто'*.

**Каментарый:**

Для атрымання 1 бала дастаткова назваць ***прычыну міжмоўнай аманіміі, параніміі і мнагазначнасці*** (***полісеміі***).

### Заданне 8

| Літаратуразнаўчы тэрмін | Азначэнне тэрміна | Нумар прыклада |
|---|---|---|
| Санет | **Форма лірычнага верша з 14 радкоў, у якім радкі звычайна рыфмуюцца ў пэўным парадку (абба абба ввг дгд ці абаб абаб ввг ддг). У першай частцы развіваецца тэма, у наступнай – робіцца выснова.** | 3 |
| **Актава** | Васьмірадковы верш, які часцей за ўсё пішацца пяцістопным ямбам і рыфмуецца па схеме *абабабвв*. | 4 |
| **Алегорыя** | Іншасказальнае адлюстраванне прадмета ці з'явы праз вобразы, якія маюць пераносны сэнс. | 6 |
| **Александрыйскі верш** | Верш з аб'яднаных папарна рыфмай вершаваных радкоў, напісаных шасцістопным ямбам з цэзурай пасля трэцяй стапы. Пры паўтарэнні ў творы некалькіх двухрадкоўяў абавязковым з'яўляецца чаргаванне мужчынскіх і жаночых рыфмаў. | 1 |



ТРЭЦІ ЭТАП XXXII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»
КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

# ДАВЕДКІ

**11 клас**

**Варыянт І**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 6 | 5 | 4 | 5 | 6 | 5 | 4 | 50 |

### Заданне 1

| Словы з першым націскным складам | Словы з другім націскным складам | Словы з трэцім націскным складам |
|---|---|---|
| дзеяч | пахмурны (пахмуры) | дыспансер |
| мускулісты | буйны | крапіва |
| | феномен | рассядланы |
| | нічому | |
| | сямёра | |

### Заданне 2

| Фразеалагізм | Фразеалагізм + дзеяслоў-суправаджальнік | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|---|
| з вуха ў вуха | ***гаварыць (перадаваць, распаўсюджваць)*** з вуха ў вуха | 'шэптам, пад сакрэтам' |
| з хворай галавы на здаровую | ***валіць (звальваць, зваліць, перакладаць, пералажыць, сапхнуць, вярнуць)*** з хворай галавы на здаровую | 'з вінаватага на невінаватага' |
| як з пісанай торбай | ***насіцца*** як з пісанай торбай | 'незаслужана ўдзяляючы шмат увагі каму-, чаму-небудзь' |
| боб з гарохам | ***блытаць (змешваць)*** боб з гарохам | '(блытаць) розныя, несумяшчальныя рэчы' |
| на горкі яблык | ***збіць (стаўчы)*** на горкі яблык | 'вельмі моцна, бязлітасна' |

**Заданне 3**

| Сказ | Лексічнае значэнне слова |
|---|---|
| А каб зразумець, дзе гарэў сяржант, вялікім ***здагадзькам*** быць не трэба: у яго на пагонах маленькія танкі (*І. Сяркоў*). | ***Здагадзька*** – здагадлівы чалавек. |
| Але і пайсці адсюль не выпадала: было зарана, адзінокі ***мінак*** на вуліцы тым болей прыцягваў да сябе ўвагу (*В. Быкаў*). | ***Мінак*** – той, хто ідзе куды-небудзь, міма каго-, чаго-небудзь; прахожы. |
| Сучаснаму чалавеку, абкружанаму з усіх бакоў разнастайнымі рэкламнымі ***спавешчаннямі***, патрэбна і "культуралагічная" рэклама (*ЛіМ*). | ***Спавешчанне*** – абвестка, аб'ява. |
| Нейкаму капралу, які абразліва пакпіў з яго беларуска-сялянскай ***інакшасці***, Васіль выплюхнуў на галаву кацялок гарачага супу (*У. Калеснік*). | ***Інакшасць*** – уласцівасць інакшага, адметнасць. |
| Праўда йдзе па зямлі, дзе ***сумёцiцца*** смеціце, дзе за ёй неадступна цікуе мана (*Р. Барадулін*). | ***Сумёцiцца*** – ляжаць, узвышацца, нібы сумёт. |

**Выкарыстаная крыніца:**

*Каўрус, А.А.* Словаклад : слоўнік адметнай лексікі / А.А. Каўрус. – Мінск : Выд. дом «Звязда», 2013. – 328 с.

**Заданне 4**

| Прыклад на рускай мове | Беларускамоўны адпаведнік | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| **Узор:** *картофельная ботва* | *бульбоўнік* | *бульб(а)* + *оўнік* (□) | *суфіксальны* |
| прийти в сознание | апрытомнець | а + прытомн(ы) + е (ць) | прыставачна-суфіксальны |
| ремесло землекопа | грабарства | грабар(□) + ств (а) | суфіксальны |
| канун весны, предвесеннее время | прадвесне | прад + вясн(а) + ø (е) | прыставачна-нульсуфіксальны |
| предприятие по производству растительного масла | алейня | алей(□) + н (я) | суфіксальны |



**Заданне 5**

| Складаны назоўнік | Форма меснага склону адзіночнага ліку |
|---|---|
| жанчына-прафесар | *пры жанчыне-прафесару* |
| інжынер-маёр | *па інжынер-маёру* |
| вакуум-камера | *у вакуум-камеры* |
| матыль-бражнік | *пры матылі-бражніку* |
| камедыя-буф | *у камедыі-буф* |

АБГРУНТАВАННЕ:

У складаных назоўніках, што пішуцца праз злучок, можа змяняцца адна ці дзве часткі. Дзве часткі слова скланяюцца, калі назоўнікі з'яўляюцца састаўнымі назвамі машын, прадметаў, устаноў, культурных мерапрыемстваў, жывёл і раслін (*ракеты-носьбіта, вагона-рэстарана, хаты-чытальні, лекцыі-канцэрта, грушы-спасаўкі* і інш.), абазначаюць прафесію, пасаду, званне (*касманаўта-дублёра, жанчыны-ўрача,* інжынера-эканаміста і інш.). У састаўных назвах воінскіх званняў першая частка складанага слова не змяняецца: *генерал-лейтэнанта, інжынер-маёра* і інш. Першая частка не змяняецца і ў састаўных назоўніках, якія з'яўляюцца адзінкамі вымярэння фізічных велічынь: *кілават-гадзіна, тона-кіламетр* і інш. Як нязменны кампанент выступае першая частка складаных слоў, якая па сваім значэнні набліжаецца да прыметнікаў: *блок-карты, борт-механіка, вакуум-камера* і г.д. Нязменнай можа быць і другая частка складанага назоўніка, калі яна пададзена кампанентамі *-максімум, -мінімум, -фікс, -буф*: *праграмы-максімум, ідэі-фікс* і г.д.

**Заданне 6**

1. Прасек [дзядзька] палонку, крыгу *~~вынуў~~* [***выняў***], тады на бучык вока кінуў… (Я. Колас). 2. "А ў чым чалавечае шчасце, вяшчун?" – хацеў крыкнуць я, ды *змоўчаў* [**правільная форма**], бо ведаў, што ніхто не зможа даць адказ (Л. Дайнека). 3. Я знішчу свет, я знішчу чалавека. *~~Апрыкрыні~~* [***апрыкралі***] і добрыя, бо хочуць дабрэйшымі зрабіцца за мяне (У. Караткевіч). 4. Міндоўг жа муляўся – з аднаго боку, заседзеўся ён у замку, войска навагародскае *~~прагла~~* [***прагнула***] вольнага ветру паходаў, радасці здабычы і гарачага мяча (В. Іпатава). 5. Хто *~~занядужэць~~* [***занядужае***] – дапаможа, хто разняверыцца – скране. Няпраўду праўда пераможа – і шчасце вас не абміне! (С. Панізнік).

**Заданне 7**

1) ~~Утварэнне~~ **Адукацыя (асвета)** – тое, што застаецца пасля таго, калі забываецца ўсё, чаму вучылі (*А. Эйнштэйн*).

2) Юнацкасць ~~бескарысная~~ **бескарыслівая** ў намерах і пачуццях, таму яна найболей глыбока разумее і адчувае праўду (*Г. Гейнэ*).

3) Мала хто з нас можа вынесці ~~бярэмя~~ **цяжар** багацця. Вядома, чужога (*М. Твен*).

4) ~~Нехта~~ **Ніхто** не зможа выхаваць чалавека, калі ён сам сябе не выхоўвае (*В. Сухамлінскі*).

**Каментарый:** 1 бал за выпраўленую памылку.

| | | |
|---|---|---|
| – Глупства, што часамі нябожчык Цыпрук гаварыў... Як гэта ён мяне не прыме? Я ж – яго матка!.. Я ж яго гадавала і карміла... Ён жа – уся пацеха мая. | Старая Тэкля | **“На Калядах к сыну** **Змітрок Бядуля** |
| – Я ведаю, ёсць многа добрых людзей, людзей з усёабдымным, з чалавечым сэрцам. Такіх, як вы. Але што я магу зрабіць, калі мне ўсё жыццё будуць трызніцца тыя дзесяць хвілін, на якія я спазнілася. Калі для сэрца чалавечага няма і не будзе забыцця... | Жонка Грынкевіча | **“Паром на бурнай рац** **Уладзіміра Караткевіч** |

**Каментарый**: за кожны правільны адказ налічваецца 0,5 бала; калі правіль названы толькі твор ці толькі аўтар, то замест 0,5 бала налічваецца 0,25 бала.

**Заданне 10**

| | |
|---|---|
| 1. Да якой разнавіднасці лірыкі можна аднесці гэты твор? | **Філасофскай** |
| 2. Дайце характарыстыку лірычнага героя адным сказам? | **Чалавек, які пакланяецц маці і імкнецца данесці ўсім, што маці – Бог** |
| 3. Выпішыце цытату з верша, у якім сфармулявана яго ідэя | **Бог – твая маці** |
| 4. Які паэтычны троп выкарыстаны ў вылучаным курсівам радку? | **Эпітэт** |
| 5. Якая сінтаксічная (стылістычная) фігура выкарыстана паэтам у трэцім радку? | **Рытарычны зваротак** |

**Каментарый**: за кожны правільны адказ налічваецца 1 бал.